помочь Андрею Андреевичу своим авторским видением, а точнее слышанием песни. Надо отдать ему должное. Этот замечательный музыкант, джазовый пианист, композитор и аранжировщик с большим вниманием и, как я сейчас понимаю, терпением выслушивал мои творческие пожелания. Надо сказать, что и Михаил Финберг позволял мне на первых репетициях песни не только присутствовать, но и высказывать пожелания по аранжировке гитаристу оркестра, моему недавнему студенту Сергею Антишину, в каком стиле исполнять соло или показывать на синтезаторе, что и как должен играть клавишник оркестра, замечательный музыкант Анатолий Гидгарц. Удивительно, но все мои предложения принимались, и песня стала принимать задуманные очертания. Через несколько месяцев она прозвучала в г. Горьком (совр. Нижний Новгород) на молодежном пленуме Союза композиторов СССР. Но еще на репетициях встал вопрос о названии. В сборнике молодых советских поэтов стихотворение его не имело. Репертуар концерта в Горьком надо было отправлять в Москву, в Союз композиторов СССР, для чего требовалось указать название. И тогда Александр Тиханович, в то время присутствующий на репетиции, предложил назвать песню, которая ему очень понравилась, «Откровение». Так на концерте в Горьком и объявили: «Песня Олега Елисеенкова на стихи Леонида Агеева “Откровение”. Исполняет Александр Солодуха».

УДК 78.03(476.5)

***А. М. Емялёва,***
*старшы выкладчык кафедры гісторыі і тэорыі мастацтва установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў», г. Мінск, Беларусь*

## АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ ВІЦЕБСКА Ў XIX ст.

**Анатацыя.** Разглядаюцца асноўныя тэндэнцыі развіцця музычнай культуры Віцебска ў XIX ст., разнастайныя формы музычнага жыцця горада. Дзейнасць вядомых асоб – музыкантаў, кампазітараў, выканаўцаў, музычных гурткоў і аб’яднанняў, аркестраў і ансамбляў спрыяла культурнаму развіццю традыцыйных напрамкаў музычнай культуры і з’яўленню новых, сучасных тэндэнцый. Культурнае жыццё тагачаснага

Віцебска было вельмі шматбаковым і глыбока ўспрымала і засвойвала тэндэнцыі заходнееўрапейскага і рускага музычнага мастацтва, спрыяла ўзбагачэнню мясцовай культурнай глебы.

**Ключавыя словы:** тэндэнцыі развіцця, музычная культура, музычнае мастацтва, формы музычнага жыцця, рамантычны стыль, музычна-сцэнічныя творы, жанр музычнай мініяцюры, дэмакратызацыя мастацтва, гастрольная дзейнасць, беларускі фальклор, прафесійная музыка, музыканты-выканаўцы, канцэртная дзейнасць, хатняе музіцыраванне, аматарскае мастацтва, чыноўніцкія аркестры, сімфанічная і камерна-інструментальная музыка, прыватныя пансіёны.

***A. Yemialeva,***
*Senior Lecturer of the Department of History and Theory of Art*
*of the Educational Institution "The Belarusian State University*
*of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

## MAIN TENDENCIES OF THE DEVELOPMENT OF MUSICAL CULTURE OF VICETSEBSK IN THE 19th century

**Abstract.** The article examines the main trends in the development of the musical culture of Vitebsk in the 19th century, various forms of the city's musical life. The activities of famous people - musicians, composers, performers, musical groups and associations, orchestras and ensembles contributed to the cultural development of traditional areas of musical culture and the emergence of new, modern trends in the 19th century. This contributed to a significant revitalization of social and cultural life, which musical Vitebsk had to experience as well, whose cultural life was very multifaceted and deeply perceived and assimilated the trends of Western European and Russian musical art, contributed to the enrichment of the local cultural soil.

**Keywords:** development trends, musical culture, musical art, forms of musical life, romantic style, musical and stage works, genre of musical miniature, democratization of art, touring activity, Belarusian folklore, professional music, performing musicians, concert activity, home music making, amateur art, official orchestras, symphonic and chamber-instrumental music, private boarding houses.

Віцебск у XIX ст. з'яўляўся адным са значных культурных цэнтраў, вакол якога канцэнтравалася мастацкае жыццё Віцебшчыны. З 1802 г. ён робіцца губернскім горадам. Праз яго праходзілі два буйнейшыя тракты – Масква – Вільня і Санкт-Пецярбург – Кіеў, што спрыяла культурнаму абмену паміж суседнімі краінамі. Таму ў той час у Віцебску назіралася тэндэнцыя скрыжавання культурных традыцый Расіі, Украіны,

Польшчы. Таксама для музычнай культуры Віцебска было характэрна суіснаванне розных эпох і стыляў – барочных, класічных, рамантычных і рэалістычных. Аднак значная частка мясцовай інтэлігенцыі паступова пачынала разумець і прымаць самабытнасць беларускай культуры, яе традыцыі, мову.

Асноўным напрамкам у музычнай культуры XIX ст. з’яўляўся рамантызм, які меў, з аднаго боку, уплыў класіцызму, а з другога – рэалізму. Назіраецца тэндэнцыя сінтэтычнага ўзаемадзеяння ўсіх відаў мастацтва, асабліва гэта прасочваецца на прыкладзе музычнага мастацтва як найбольш экспрэсіўнага і эмацыянальна-ўзрушанага. Рамантычны стыль атрымаў назву «нацыянальны рамантызм» з-за павышэння ўвагі да фальклорных традыцый, сельскага ладу жыцця і іх паэтызацыі. Рысы рамантызму ў Віцебску праявіліся ў стварэнні новага жанру музычнай мініяцюры ў творах А. Абрамовіча, І. Шадурскага, Н. Орды [1].

У Віцебску ў 30–50-х гг. XIX ст. гастралявалі вядучыя дзеячы рускай, польскай і ўкраінскай музычных культур, адчыняліся новыя навучальныя ўстановы, якія вырашалі задачы падрыхтоўкі нацыянальных кадраў. Гэта таксама аказала моцны ўплыў на развіццё музычнай культуры Віцебшчыны, у выніку чаго адзначалася развіццё шматбаковых і поліфункцыянальных з’яў. Тэндэнцыя да дэмакратызацыі мастацтва пацвярджалася стварэннем у Віцебску гарадскіх аркестраў, якія выступалі ў гарадскіх садах і парках (напрыклад, у парку «Цівалі»). У аркестры прымаліся прадстаўнікі бедных саслоў’яў, якія ўпершыню маглі вучыцца ў прафесійных настаўнікаў. На гарадскіх плошчах гучалі аркестры і ансамблі духавых, струнных і беларускіх народных інструментаў [2–5].

У гэты час найбольш актыўна праявілася дзейнасць мясцовых музыкантаў, кампазітараў. Узнікалі новыя цэнтры музычна-тэатральнай культуры – А. Буйніцкага ў Забор’і, А. Галіцына ў Віцебску. У Забор’і, напрыклад, ставілася аперэта мясцовага кампазітара-аматара Ражкоўскага, які з’яўляўся пастаноўшчыкам опер. Для заборскай сцэны пісаў музыку і другі мясцовы кампазітар і рэжысёр Карбоўскі. Творы Ражкоўскага і Карбоўскага карысталіся поспехам сярод тутэйшай публікі і папаўнялі колькасць оперных твораў для выканання на сцэне Заборскага тэатра. Тэндэнцыя стварэння музычна-сцэнічных пастановак музыкантамі-аматарамі была вельмі характэрнай

з'явай для Віцебска XIX ст. Захаваўся адзіны ўрывак з аперэты «Тарас на Парнасе» кампазітара І. В. Шадурскага, які кіраваў квартэтам і сімфанічным аркестрам музычнай секцыі Віцебскага музычна-драматычнага гуртка. Гэты ўрывак – танец «Лявоніха» – быў надрукаваны ў 1912 г. у літаратурна-краязнаўчым зборніку «По окрестностям Двины (Z okoliec Dzwiny)». У танцы вар'іруюцца харэаграфічныя тэмы, заснаваныя на беларускіх плясавых песнях, і матывы, падобныя да «Камарынскай» М. І. Глінкі.

Адной з вядучых і знакамітых фігур у кампазітарскай, выканальніцкай і педагагічнай дзейнасці XIX ст. з'яўляўся А. І. Абрамовіч, які быў родам з Віцебскага павета. Ён амаль адным з першых беларускіх кампазітараў стаў выкарыстоўваць беларускі фальклор у прафесійнай музыцы. Абрамовіч напісаў каля 50 твораў у розных жанрах – вальсы, галопы, паланэзы, полькі, фантазіі, песні, рамансы, інструментальныя творы. Сярод іх – Вялікі канцэртны вальс, кадрыля «Шесть времён года», паланэз, прысвечаны памяці С. Манюшкі, «Зачараваная дуда» на тэмы беларускіх песень і танцаў і інш. Кампазітар быў вядомы як аўтар працы па методыцы выкладання фартэпіяннай ігры «Школа для фартэпіяна» і надаваў вялікую ўвагу выканальніцкаму майстэрству. Яго музычныя творы на беларускія вершы Я. Баршчэўскага «Дзеванька», «Гарэліца» ляглі ў аснову рамансаў і былі надрукаваны ў 1843 г. у «Pomniku Literackim» Р. Падбярэскага. У зборнік увайшлі таксама дзве народныя песні, апрацаваныя А. Абрамовічам, – «Зязюлька» і «Дуда» і інструментальны твор – паэма «Беларускае вяселле», што ўяўляла сабой апрацоўку песенна-танцавальнага фальклору і пераўтварэнне яго на прафесійнай аснове. А. Абрамовіч паклаў пачатак выкарыстанню ў прафесійнай беларускай музыцы тэматызму народных песень і танцаў.

У музычным жыцці тагачаснага Віцебска адбываліся значныя змены ў параўнанні з мінулым. Можна назіраць тэндэнцыю актывізацыі канцэртаў сімфанічнай і камерна-інструментальнай музыкі, якія выконваліся аркестрамі і ансамблямі створаных у XIX ст. навучальных установ (гімназій, семінарый, прыватных пансіёнаў). Значнага росту дасягае хатняе музіцыраванне і аматарскае мастацтва. У 40–60-х гг. XIX ст. адзначаецца асаблівая інтэнсіўнасць у музычным жыцці Віцебска ў сувязі з наведваннем горада вядомымі артыстамі і тэат-

ральнымі трупамі. Канцэрты праводзіліся ўсюды – у гарадскіх скверах, парках, на плошчах, у залах гімназій і семінарый, зале Дваранскага сходу ў губернатарскім палацы, хатнім тэатры ў доме губернатара князя А. М. Галіцына. Кіравалі музычна-сцэнічнымі пастаноўкамі вядомыя дзеячы таго часу – капельмайстар Г. Ягеман і балетмайстар М. Піён [6, с. 8].

У канцы 1850-х гг. назіраўся некаторы спад у музычным жыцці горада, звязаны з недахопам прафесійных артыстаў, таму найбольш значныя падзеі гэтага напрамку перайшлі ў аматарскія тэатры і адбываліся на аматарскіх вечарынах. Адзначалася павышэнне цікавасці да аматарскага мастацтва. Адной з ініцыятараў такіх мерапрыемстваў была княгіня С. П. Галіцына, дзякуючы якой усе культурныя навіны таго часу з найбольш буйных цэнтраў – Масквы, Санкт-Пецярбурга, Кіева, Рыгі – паступалі перш за іншыя беларускія гарады ў Віцебск. Але, акрамя вытанчаных увесяленняў багатай публіцы, існавала магчымасць і для простага насельніцтва горада паслухаць бульварныя аркестры, наведваць павільёны, дзе можна было патанцаваць. Сярод канцэртных пляцовак Віцебска можна адзначыць Еўрапейскі і Елагскі сады, сад Брозі, парк «Цівалі» з летнім тэатрам «Ваксал», летні сад «Еўропа» [8, с. 4].

З 1860 г. чыноўніцтва вылучаецца як асобная праслойка інтэлігенцыі. Пачынаюць ствараецца хатнія спектаклі, чыноўніцкія аркестры пад кіраўніцтвам братоў Д. і С. Жараўскіх, братоў Цэліцо і іншых віцебскіх аматараў музычнага мастацтва. У 1870–1880-х гг. значна актывізавалася дзейнасць аматараў, якія маглі нават канкурыраваць з прафесійнымі калектывамі па рэпертуары, выканальніцтве і рэжысуры. З другой паловы 1880-х гг. членамі мясцовага музычна-драматычнага аб’яднання актыўна праводзіліся аматарскія вечарыны, на якіх выконваўся сур’ёзны рэпертуар – арыі і сцэны з опер Д. Меербера, А. Р. Рубінштэйна, П. І. Чайкоўскага, С. Манюшкі, аперэт Ж. Р. Планкета, Р. Штрауса, Ф. фон Зупе.

Члены «Музычна-драматычнага гуртка» і «Аб’яднання музычнага і драматычнага мастацтва» займаліся не толькі канцэртнай дзейнасцю, але і арганізоўвалі ў Віцебску гастролі вядомых замежных калектываў і выканаўцаў – Венскага аперэтачнага тэатра, харавой капэлы Н. Д. Славянскай, хору пад кіраўніцтвам А. Архангельскага. Для гэтых аб’яднанняў была характэрна дабрачынная дзейнасць дзеля падтрымкі студэн-

цтва, дзяцей, бедных слаёў насельніцтва. У адным з такіх мерапрыемстваў прымаў удзел у 1899 г. І. Я. Рэпін [9–12].

Асаблівую цікавасць мясцовай публікі выклікалі оперы, што раней не гучалі на сцэне Віцебска. Сярод іх «Камора» Е. Д. Эспазіта, якая вызвала цікавасць і задавальненне ў гледачоў. Майстры, прыязджаючыя ў Віцебск, прыносілі карысць мясцовым музыкантам-аматарам і садзейнічалі ўздыму музычнай культуры горада. Адным з арганізатараў вышэйназваных гуртка і аб’яднання быў кампазітар і педагог М. В. Анцаў, які жыў у Віцебску з 1896 г. [7]. Тут ён пачаў сваю кампазітарскую, музычна-педагагічную дзейнасць, супрацоўнічаў з выданнем «Витебские губернские ведомости», выступаў як музычны і тэатральны крытык. Сярод яго твораў ёсць хары, рамансы, п’есы для фартэпіяна і скрыпкі. У 1899 г. ён стварыў кантату «К столетию А. Пушкина». У Віцебску Анцаў напісаў два вучэбныя дапаможнікі – «Нотная тэрміналогія» і «Метадычная хрэстаматыя» – і працу «Краткие сведения для певцов-хористов», якія карысталіся папулярнасцю сярод настаўнікаў, выканаўцаў-музыкантаў. Такім чынам, зацікаўленасць аматарскай творчасцю стварала спрыяльныя ўмовы для развіцця музычнай культуры Віцебска.

Наступнай важнай тэндэнцыяй развіцця музычнай культуры горада можна назваць канцэнтрацыю музычнага жыцця вакол прыватных пансіёнаў і салонаў. У Віцебску XIX ст. славіліся хатнія пансіёны А. Яноўскай, Л. Чаплінскай, А. Рэзенер, К. Зейдэль, салоны Корвін-Крукоўскіх, Буйніцкіх, Нітаслоўскіх. Выхаванцы прыватных пансіёнаў прымалі ўдзел у музычным жыцці горада, некаторыя з іх потым сталі прафесійна займацца музыкай і выступаць з канцэртамі ў розных іншых гарадах. Можна сказаць, што пансіёны і салоны адыгрывалі сур’ёзную ролю ў падрыхтоўцы музыкантаў-прафесіяналаў.

Такім чынам, XIX ст. – час ажыўлення розных напрамкаў і форм музычнага жыцця, з’яўлення новых цікавых тэндэнцый развіцця музычнай культуры Віцебска, якія спрыялі значнай актывізацыі грамадска-культурнага жыцця, што глыбока ўспрымала і засвойвала тэндэнцыі заходнееўрапейскага і рускага музычнага мастацтва, дапамагаючы ўзбагачэнню мясцовай культурнай глебы.

*1.* Витебск : энцикл. справ. / Белорус. сов. энцикл. ; редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелСЭ, 1988. – 406 с. : ил.

*2.* Витебские губернские ведомости. – 1860. – № 8. – 20 февр.

*3.* Віцебскі сшытак. – 1995. – № 1.

*4.* Віцебскі сшытак. – 1996. – № 2.

*5.* Віцебскі сшытак. – 1997. – № 3.

*6. Мальдзіс, А.* Падарожжа ў XIX стагоддзе: з гісторыі беларускай літаратуры, мастацтва і культуры : навук.-папул. нарысы / А. Мальдзіс. – Мінск : Нар. асвета, 1969. – 208 с.

*7.* Музыкально-педагогические взгляды и деятельность Михаила Васильевича Анцева: из истории музыкального воспитания в Белоруссии : метод. рекомендации / В. В. Ковалив [и др.] / М-во народного образования БССР, Минск. гос. пед. ин-т им. А. М. Горького. – Минск : МГПИ, 1990. – 26 с.

*8. Никифоровский, Н. Я.* Странички из недавней старины города Витебска: юбилейное издание: с планом города, древним чертежом замка и 8-ю отдельными видами / Н. Я. Никифоровский. – Витебск, 1899. – 250 с. : [9] л. ил.

*9. Пракапцова, В. П.* Мастацкая адукацыя ў Беларусі / В. П. Пракапцова. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1999. – 209 с.

*10. Сапунов, А.* Губернаторский дворец в Витебске [Электронный ресурс] / А. Сапунов. – Витебск, 1901. – Минск : Национальная библиотека Беларуси, 2011. – Режим доступа: http://content.nlb.by/content/dav/nlb/DDC/DED/IS/_2011/is000021/is000021.html. – Дата доступа: 25.08.2022.

*11. Сапунов, А.* Полоцк, Витебск и Минск в 20-х годах прошлого века / А. Сапунов. – Витебск : Губернская типолитография, 1901. – 28 с. Опубл. Минск : Госбиблиотека БССР, 1981. – 1 микрофильм рулонный.

*12. Сементовский, А. М.* Витебск и уездные города Витебской губернии: с тринадцатью политипажами в тексте и портретом архиепископа Полоцкого и Витебского Василия [Электронный ресурс] / А. М. Сементовского, Императорского Русского географического общества члена-сотрудника и Витебского статистического комитета секретаря. – СПб. : в Типографии К. Вульфа, 1864. – 140 с. – Режим доступа: http://content.nlb.by/content/dav/nlb/DDC/DED/9/4/7/6/5/ba593/ba593.html. – Дата доступа: 25.08.2022.